рецензия на выяснении того или иного аспекта произведения, критик непременно должен исходить в своем анализе и оценках из этой целостности и завершенности, степени их проявления в данном произведении. Целостность — это диалектическое единство общего и отдельного, которые невидимыми нитями связаны и взаимопроникаемы. Методология познания взаимодействия общего и отдельного есть ключ к рассмотрению взаимосвязи элементов, их взаимопереходимости и взаимообусловленности. Элементы, взятые порознь, превращаются в нечто разрозненное и отдельное. Взятые из разных произведений, они могут вполне походить друг на друга. Но в том-то и дело, что они существуют в общем, целостном. И, соединяясь в единое, они делают это единое неповторимым, уникальным. Вне целого они не существуют, как не существует целое вне единства элементов.

Такая методология, на наш взгляд, определяет в жанре рецензии глубину осмысления мира. Ведь жанр — это определенное видение мира, это форма мироощущения. Критик, оперирующий готовыми рецептурными блоками, видит в жанре лишь внешний шаблон, в то время как критик-художник пробуждает заложенные в нем смысловые возможности.

Мы уже говорили о внутренней связи элементов. Следует добавить: эта внутренняя связь, единство находятся в прямой зависимости от целостности мироощущения художника, целостности его личности. Также и целостность литературно-критического произведения зависит от целостности мироощущения критика, его личности. М. М. Бахтин как-то задал вопрос: что гарантирует внутреннюю связь элементов личности? И сам на него ответил: «Только единство ответственности. За то, что я пережил и понял в искусстве, я должен отвечать своей жизнью, чтобы все пережитое и понятое не осталось бездейственным в ней»[2]. Хорошо, если бы это было применимо к личности критика, к его ответственности за то, что им сделано по отношению к искусству и к жизни.

[1] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 39. С. 67.
[2] Бахтин М. М. Эстетика словесного творчества. М., 1979. С. 5.

У. У. ГЛОД

## АКТУАЛЬНАСЦЬ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ЖАНРАЎ

Праблема выбару формы, жанра — адна з самых актуальных для прэсы ў сувязі з паглыбленнем тэматыкі, пашырэннем дыяпазону сацыяльных задач, якія вырашае журналістыка, яе імкненнем павялічыць аудыторыю чытачоў, узмацніць уздзеянне на яе. Гэта зразумела — авалодаць жанрамі, значыць, у многім авалодаць прыёмамі майстэрства, уменнем рыхтаваць цікавыя публікацыі. Не выпадкова газета «Физкультурник Белоруссии», звяртаючыся да сваіх чытачоў, разам з пытаннямі аб змесце, тэмах і ідэях выступленняў, уключыла ў анкету пытанне: «Якія газетныя жанры найбольш прыцягваюць вашу ўвагу?»[1]. Выбар жанра адлюстроўвае пункт гледжання журналіста на той эмпірычны матэрыял, які ён збіраецца арганізаваць у паведамленне. Вядома, што паняцце «жанр» (слова па паходжанню французскае, азначае «род», «від») звычайна выкарыстоўваецца для ўказання рода (драма, лірыка, эпас) і віда (апавяданне, аповесць, раман і г. д.) літаратурных твораў. Другое значэнне паняцця «жанр» у журналістыцы стала асноўным. «Гэтым паняццем абазначаюць устойлівыя, паўторныя, характэрныя для данага тыпу дзейнасці віды змястоўна-структурнай арганізацыі яе твораў. Жанры сфарміраваліся як аптымальныя формы рашэння творчых задач, найбольш характэрныя для таго ці другога тыпу дзейнасці. Такі шлях развіцця і станаўлення сістэмы жанраў і ў журналістыцы. Інфармацыйная заметка — зыходны жанр публікацый, якія запаўнялі старонкі «навароджаных» газетных выданняў. Пастулова ў журналістыцы ўсталёўваюцца разнастайныя формы публікацый»[2]. Карацей кажучы, жанры — гэта «устойлівыя формы адлюстравання рэчаіснасці, якія валодаюць паўторнымі сутнаснымі і структурнымі прыкметамі...»[3]

Сучасныя газетныя жанры — надзвычай складаныя і разнастайныя. І тым не менш, паняцце жанра — не абстракцыя, а рэальныя структуры, гістарычна ўзнікаючыя і пераменлівыя. Нягледзячы на ўзмацнелы ў

апошні час працэс узаемапранікнення жанраў, яркай прыкметай усіх інфармацыйных жанраў працягвае заставацца іх строгая дыферэнцыяцыя. Яна, як паказвае практыка, развіваецца і паглыбляецца ў залежнасці ад мэты выдання.

Класіфіцыраваць жанры з дастатковай дакладнасцю толькі па адной прыкмеце нельга. Не выпадкова вядомы даследчык тэорыі журналістыкі М. Чарапахаў, гаворачы аб газетных жанрах, называе іх наступныя ўстойлівыя прыкметы: характар аб'екта, канкрэтнае прызначэнне, маштаб ахопу рэчаіснасці, спосаб і характар яе адлюстравання.

Разнастайныя віды жанраў аб'ядноўваюцца ў групы па сукупнасці пералічаных прыкмет. Да першай групы адносяцца інфармацыйныя жанры (заметка, справаздача, рэпартаж, інтэрв'ю, замалёўка), да другой — аналітычныя (карэспандэнцыя, артыкул, агляд друку, агляд пісьмаў, рэцэнзія), да трэцяй — мастацка-публіцыстычныя (нарыс, эсэ, фельетон, памфлет).

Асаблівую цікавасць выклікаюць інфармацыйныя жанры. Іх аб'ядноўвае агульнае прызначэнне — праінфармаваць аб новым, аператыўна паведаміць аб факце, з'яве, падзеі. Ім, у першую чаргу, уласціва актуальнасць. Яны ідуць па гарачых слядах падзей, аператыўна адлюстроўваюць самыя важныя з'явы сучаснасці. Аднак, як адзначалася ў дакладзе В. Афанасьева на з'ездзе Саюза журналістаў СССР, «у іх (публікацыях аб з'явах і падзеях — В. Г.) мы часта адчуваем дэфіцыт. Неабходна пастаянна павышаць інфармацыйную насычанасць нашага друку»[4].

Практыка пераконвае, што дзейснасць многіх невялікіх матэрыялаў часта не меншая, чым некаторых вялікіх артыкулаў. Але для гэтага патрэбна правільна выбраць аб'ект інфармацыі, прадумаць кампазіцыю, праверыць і адабраць факты, ёмка і востра выказаць думку. І тады ў матэрыялах інфармацыйных жанраў можна паставіць важныя пытанні, закрануць значныя праблемы, бо жанр у прэсе — гэта грунтоўны сродак распрацоўкі тэмы паведамлення і ў той жа час — развіцця яго зместу і формы. Так, у інфармацыйных матэрыялах няма філасофскіх абагульненняў альбо шырокіх вывадаў, якія ўласцівы, скажам, артыкулу. Але жывы паказ, які падмацоўваецца красамоўнымі лічбамі, дапамагае чытачу праясніць праблему.

Навізна факту, высокі ўзровень аператыўнасці паведамлення з'яўляюцца асноватворнымі для інфармацыйных жанраў. Іх аб'ядноўвае таксама падзейная падстава для выступлення. Чытач, узяўшы ў рукі газету, звычайна шукае навіны. І не проста навіны, а паведамленні праўдзівыя, аператыўныя, пададзеныя з партыйных пазіцый, па-майстэрску, выкананыя літаратурна, гэта значыць афармленыя публіцыстычна. Не выпадкова ў Пастанове ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы» зноў падкрэсліваецца неабходнасць павышаць інфармацыйную насычанасць матэрыялаў, якія друкуюцца ў газетах і часопісах, з'яўляюцца на экранах тэлевізараў, гучаць па радыё. Дарэчы напомніць і рэкамендацыі партыі аб тым, што ўся ідэйна-выхаваўчая работа павінна весціся жыва і цікава, без штампаваных сказаў і стандартнага набору гатовых формул.

Сёння, адлюстроўваючы якасныя зрухі, якія мы бачым у нашай рэчаіснасці, духоўны рост савецкага чалавека, інфармацыйныя матэрыялы друку ўсё часцей убіраюць у сябе асобныя якасці публіцыстыкі. Гэта тэндэнцыя, на наш погляд, характэрна і для публікацый на тэмы фізічнай культуры і спорту. Тут, як і ва ўсёй журналістыцы, актыўна здзяйсняецца ўзаемадзеянне двух пачаткаў: інфармацыйнага і аналітычнага. Іх зліццё дапамагае выяўляць сутнасць з'явы, павышае дзейснасць інфармацыйных жанраў, забяспечвае дасягненне практычных вынікаў, дзелавога рэагавання.

Змястоўнай асновай інфармацыйных жанраў, прадметам адлюстравання ў іх заўсёды служаць канкрэтныя з'явы, падзеі і факты. Структура такога жанру падпарадкавана задачы аператыўнага, па магчымасці сціслага, паведамлення аб факце, аб падзеі. Але ўжо з адбору факта пачынаюцца і элементы аналітыкі. Як падкрэслівае даследчык друку Я. Прохараў, «ужо сама канстатацыя факта, апісанне яго так альбо інакш адлюстроўвае вынік асэнсавання падзеі журналістам, уключае ў асаблівай форме яго разуменне і ацэнку»[5].

Жаданне надаць інфармацыйным матэрыялам больш насычанасці, баявітасці выклікала і пэўныя змяненні ў формах падачы такіх публіка-

цый. Сучасная інфармацыя ўвабрала ў сябе элементы шэрагу газетных жанраў, зрабілася больш глыбокай па зместу і шматпланавай па форме. Вызначылася выразная тэндэнцыя ў развіцці традыцыйных інфармацыйных жанраў. Гэта — паглыбленне і пашырэнне аналітычнага характару публікацый, інтэнсіўнае выкарыстанне аналітычных метадаў адлюстравання рэчаіснасці.

Пошук у галіне жанраў, як паказвае вопыт беларускіх газет, адкрывае і новыя творчыя магчымасці для журналістаў. Не выпадкова ў рэспубліканскім друку ўсё радзей сустракаюцца артыкулы ў форме так званай «справаздачы» таго ці іншага кіраўніка. Іх месца ўсё часцей займаюць матэрыялы другіх жанраў, якія захоўваюць актуальнасць праблематыкі, але выгадна адрозніваюцца ад кананічных публікацый свежасцю інтанацый, паглыбленай думкай, значнасцю падзей.

Такім чынам, журналісцкая інфармацыя не толькі паведамляе аб фактах і падзеях, але і растлумачвае, трактуе іх. У працэсе асваення рэчаіснасці раскрываюцца патэнцыяльныя магчымасці жанраў. Абагачэнне зместу дазваляе паўней выкарыстоўваць магчымасці іх структуры.

[1] Физкультурник Белоруссии. 1981. 31 октября.

[2] Ученова В. В. Современные тенденции развития журналистских жанров // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 10. Журн. 1976. № 4. С. 17.

[3] Жанры советской газеты. М., 1972. С. 7.

[4] Афанасьев В. Г. Оправдаем высокое доверие // Журналист. 1982. № 4. С. 10.

[5] Прохоров Е. П. Партийность информации // Проблемы информации в печати. М., 1971. С. 25.